НАША ПАМЯЦЬ

# Пакінуў добры след ён на роднай зямлі

**Час няспынна бяжыць, але ў імклівай плыні падзей мы зноў і зноў вяртаемся ў мінулае, бо без яго няма ні сучаснага, ні будучага. У нашай памяці ўсплываюць лёсы землякоў, якія набліжалі час вызвалення, з песняй славы пераможцаў вярнуліся з вайны і аднавілі разбураную краіну, выхоўвалі патрыётаў сваёй Айчыны асабістым прыкладам служэння Радзіме. У ліку такіх і ўраджэнец вёскі Новая Дуброва Мікалай Нічыпаравіч Бялькевіч.**



**Сёлета мы будзем адзначаць значную дату – 80-годдзе вызвалення роднай зямлі і беларускага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў – і ўслаўляць неўміручы подзвіг адважных барацьбітоў. Мужна змагаўся з ворагам і наш зямляк Мікалай Нічыпаравіч БЯЛЬКЕВІЧ.**




**Нагрудны знак «Выдатнік народнай асветы» – узнагарода за ўзорную працу на ніве выхавання і навучання падрастаючага пакалення. Дарэчы, старэйшы сын і ўнук працягваюць справу Мікалая Бялькевіча.**

Ён нарадзіўся 17 чэрвеня 1923-га ў сялянскай сям'і. Юнацкія гады прыйшліся на час, калі адбывалася станаўленне маладой савецкай дзяржавы, будаўніцтва індустрыі, арганізацыя калектыўных гаспадарак, вялася барацьба з непісьменнасцю, гартавалася маладзёжная арганізацыя. Перад ваенным ліхалеццем Мікалая, які закончыў дзесяцігодку, запрасілі ў райкам камсамола, дзе пасля нядоўгай размовы атрымаў накіраванне на будоўлю чыгункі ў г. Мінск. Але перш давялося набываць прафесійныя веды. Наш зямляк старанна авалодваў імі, а затым добрасумленна адносіўся да выканання даручанай справы. І з упэўненасцю глядзеў у будучыню.

Але мірнае жыццё перапыніла вайна... Мікалай рыў акопы, дапамагаў адказным работнікам эвакуіраваць дзяцей, дзяржаўную маёмасць, шматлікую дакументацыю. Аднак яму ўсё не давала спакою думка: як вярнуцца ў родныя мясціны, каб змагацца з варожай нечысцю. Таму, як толькі выпала магчымасць у выхадны наведаць родных, назад у горад не вярнуўся. Далучыўся да народных мсціўцаў. Спачатку Мікалай Бялькевіч быў у рэзерве партызанскага атрада імя Сталіна, што базіраваўся ва ўрочышчы Лысая Гара на Старобіншчыне паблізу хутара Багуслаўка (зараз п. Чырвоная Паляна). А 20 чэрвеня 1943 года афіцыйна аформлены байцом гэтага атрада брыгады №100. Маючы нямецкі «аўсвайс», хадзіў у разведку і знаёмымі з дзяцінства сцежкамі вадзіў падрыўнікоў да чыгункі, каб выканаць даручаныя камандаваннем заданні. Партызанскі атрад, у складзе якога быў Мікалай, прымаў удзел у паходах, рэйдах, засадах, а з 29 на 30 чэрвеня 1944 года вызваляў райцэнтр Старобін ад фашыстаў і двое сутак стойка стрымліваў ворага, пакуль не прыбыло падмацаванне.

У 21 год Бялькевіча прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Часу на роздум і навучанне не мелася, і яму давялося новую спецыяльнасць артылерыста асвойваць непасрэдна ў ходзе баявых аперацый. І ён, вядома ж, справіўся.

**Ураджэнец Любаншчыны прайшоў слаўны баявы шлях. У складзе І Беларускага фронта ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. Наводзіў і страляў па пазіцыях ворага спачатку з лёгкай «саракапяткі», затым 70-міліметровай артустаноўкі «гаўбіцы». У дуэлях з фашысцкімі танкамі пад разрывамі снарадаў старшы сяржант дабраўся да Усходняй Прусіі. У адным з баёў побач з пазіцыяй разарваўся варожы снарад. Наш зямляк атрымаў кантузію.**

Пасля ў шпіталі прыгадаў, як бацька Нічыпар Сцяпанавіч дзяліўся ўспамінамі, што ў гады Першай сусветнай вайны быў таксама паранены і страціў прытомнасць на землях Усходняй Прусіі. А калі ачуняў, адарваўшы ад сарочкі кавалак тканіны, перавязаў рану і за ноч дагнаў сваіх аднапалчан на новых пазіцыях...

І вось нарэшце Перамога. Ратны шлях Мікалая Бялькевіча адзначаны медалём «За адвагу», ордэнам Айчыннай вайны II ступені, пяццю падзякамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага маршала Савецкага Саюза т. Сталіна за мужнасць, праяўленую ў баях пры аваладанні важнейшымі ўмацаваннямі варожых гарадоў.

Салдат, франтавік вярнуўся на малую радзіму ў 1947 годзе. Уладкаваўся працаваць настаўнікам пачатковых класаў у школу вёскі Бычкі. Неўзабаве паступіў на завочнае аддзяленне Гродненскага педінстытута на факультэт мовазнаўства і змяніў профіль педагагічнай дзейнасці: стаў выкладаць у мясцовай сямігодцы рускую мову і літаратуру.

Мікалай Нічыпаравіч карыстаўся аўтарытэтам не толькі сярод дзяцей, а і ў дарослых вяскоўцаў. Яго паважалі за шчырасць, сур'ёзнасць, высокую свядомасць. Нездарма ў 1956-м на чарговым справаздачным сходзе працаўнікі калгаса «Чырвоная ветка» абралі настаўніка старшынёй гаспадаркі. Тры гады разам з вяскоўцамі шчыраваў над уздымам яе эканомікі, паляпшэннем сацыяльна-бытавых умоў жыцця.

Але, так бы мовіць, з прызваннем не паспрачаешся: яго цягнула да дзяцей, да школьных спраў. Таму па асабістым жаданні Бялькевіча перавялі намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Атраднаўскай сярэдняй школы. З галавой ён акунуўся зноў у навучальны працэс, наладжваў выхаваўчую работу для юных вяскоўцаў з улікам уласнага вопыту і патрабаванняў часу. Як вопытнага кіраўніка і прафесіянала, Мікалая Нічыпаравіча хутка прызначылі дырэктарам Турокскай школы, дзе таксама плён яго быў заўважаны.




**У сямейным архіве захоўваюцца дакументы, якія сведчаць пра доблесць продка і нагадваюць нашчадкам пра яго слаўны жыццёвы, баявы і прафесійны шлях.**

**Руплівы сейбіт разумнага, добрага, вечнага, адказны і старанны энтузіяст-наватар загадам №154 ад 30 снежня 1968 года ўзнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы БССР».**

Словам, усё складвалася як трэба, праца прыносіла задавальненне, а вынікі ад яе грэлі сэрца і натхнялі на новыя здзяйсненні. Але былыя раны ўсё часцей пачалі нагадваць пра сябе. І малодшы сын прапанаваў бацькам пераехаць у г.п. Старобін, каб аказваць ім неабходную дапамогу.

Сэрца ветэрана-патрыёта перастала біцца ў 2008 годзе. Але памяць пра яго жывая. Родныя часцяком прыгадваюць словы М.Н. Бялькевіча: «У жывых ёсць шмат праў: на каханне, сяброўства, шчасце, на працу на карысць Радзімы. А вось права забыцца пра тое, што зрабілі нашы салдаты дзеля Перамогі, Бацькаўшчыны і ў імя жыцця на Зямлі, няма!».

Мне здаецца, да гэтага запавету няма чаго дадаць. Застаецца данесці да моладзі як крэда жыцця: «Пакуль мы жывём, мы памятаем...»

**Анатоль ВЯЛІЧКА,**
**кіраўнік раённага рэсурснага цэнтра вусна-гістарычных даследаванняў на базе Сароцкай СШ, краязнавец, член КПБ.**

І гэтак будзе – будзе з году ў год,
А тых байцоў ніколі не забудзем,
Пакуль на гэтым свеце жыць мы будзем,
Пакуль жыць будзе чалавечы род!

Алег ЛОЙКА,
«Слава вам, салдаты!».